УДК 930 (476)+357.71

***Аляксандра Артураўна Ярашэнка***
*аспірант 3-га года навучання каф. усеагульнай гісторыі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Alexandra Yarashenka***
*3-d Year Postgraduate Student of the Department of World History*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: G.Yaroshevich68@mail.ru

# САНАТОРНА-КУРОРТНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НАВУКОВАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БССР (1920-я гг.)

*На аснове архіўных крыніц асэнсавана роля спецыялізаваных органаў у развіцці санаторна-курортнага забеспячэння навуковай інтэлігенцыі 1920-х гг., абапіраючыся на архіўныя крыніцы. Выяўлена спецыфіка і асаблівасці іх дзейнасці ў БССР.*

***Ключавыя словы:*** *навуковая інтэлігенцыя БССР, санаторна-курортнае забеспячэнне, 1920-я гг.*

## *Sanatorium-Resort Support of Scientific Intelligentsia of the BSSR (1920s)*

*Based on archival sources considers the role of specialized bodies in the development of sanatorium-resort support for the scientific intelligentsia of the 1920s. The specifics and features of their activities in the BSSR are revealed.*

***Key words:*** *the scientific intelligentsia of the BSSR, sanatorium-resort support, 1920s.*

### Уводзіны

Асэнсаванне дзейнасці спецыяльных арганізацый па аказанні дапамогі навукоўцам, аналіз разнастайных форм і інструментаў іх падтрымкі ўяўляе значны навуковы інтарэс і дазваляе разглядаць праз гістарычную рэтраспектыву кадравы, інтэлектуальны, адукацыйны стан сучаснай Беларусі ад пачатку 1920-х гг., калі былі закладзены асноўныя тэндэнцыі навукова-арганізацыйнага будаўніцтва ў Беларусі.

Фінансавае і матэрыяльнае палажэнне навуковай інтэлігенцыі ў 1920-я гг. было няпростым. На гэта ўплывала шмат фактараў: адбудова пасля ваеннай разрухі, праблемы ў сельскай гаспадарцы, пачатак новай эканамічнай палітыкі. Прыкладам адлюстравання той сітуацыі з'яўляюцца лісты, накіраваныя праўленнем Беларускага політэхнічнага інстытута да А. Г. Чарвякова і У. М. Ігнатоўскага: за красавік-май 1922 г. навуковыя работнікі не атрымалі заробак зусім, а за сакавік толькі 20 % грашовага ўтрымання. Акрамя таго, «большасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў даводзілася жыць надгаладзь, асабліва тым, хто меў на ўтрыманні сем'і» [1, арк. 139]. Невялікі даход з'яўляўся адным з галоўных матываў сыхода ў рабочыя спецыяльнасці, што аказвала негатыўны ўплыў на колькасць даследчыкаў, якія займаліся навуковай дзейнасцю. Нагрузка перакладалася на тых, хто застаўся, што прыводзіла да з'яўлення праблем са здароўем вучоных:ператамлення, арганічных альбо функцыянальных захворванняў.

Перад дзяржавай стаяла пытанне аб уключэнні савецкай навукі ў сусветную навуковую прастору для сцвярджэння свайго міжнароднага аўтарытэту, таму фарміраванне ідэалагічна лаяльнай інтэлігенцыі з'яўлялася важнай задачай кіраўніцтва краіны. Санаторна-курортнае забеспячэнне было адным з відаў сацыяльнай падтрымкі навуковых работнікаў БССР [2, арк. 96], якое рэалізоўвалася праз Беларускую камісію па паляпшэнні побыту вучоных (БелКПБВ) і Секцыю навуковых работнікаў (СНР). Справаводства БелКПБВ і СНР захавалася часткова, што паўплывала на недастатковую ўвагу да дзейнасці гэтых арганізацый. Некаторыя аспекты санаторна-курортнага забеспячэння навуковай інтэлігенцыі ў 1920-я гг. разглядаліся ў кантэксце вывучэння іншых тэм. Напрыклад, даследаванне А. М. Лукашука, прысвечанае дзейнасці Амерыканскай адміністрацыі дапамогі (АРА) у Беларусі, закранае функцыянаванне

*Навуковы кіраўнік – Ігар Іванавіч Шаўчук, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

БелКПБВ [3]. Э. Г. Іофэ і Б. А. Мельцар згадвалі яе пры вывучэнні Амерыканскага яўрэйскага аб'яднанага размеркавальнага камітэта (ДЖОЙНТ) [4]. Некаторыя дадзеныя пра БелКПБВ і СНР прысутнічаюць у публікацыях М. Б. Батвінніка [5], І. І. Шаўчука [6; 7], Е. А. Дубовік і А. К. Дубовіка [8], Л. В. Івановай [9], Ю. С. Кузняцова [10].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца раскрыццё працэсу арганізацыі санаторна-курортнага забеспячэння навуковай інтэлігенцыі ў 1920-я гг.

**Санаторна-курортнае забеспячэнне навуковай інтэлігенцыі БССР (1920-я гг.)**

Ад пачатку 1920-х гг. адбываўся хуткі рост сферы паслуг, у тым ліку і рэкрэацыйных, што абумоўлена дзяржаўнай эканамічнай палітыкай, адным з вынікаў якой стала пашырэнне колькаснага складу сацыяльных слаёў, якія акумулявалі значныя фінансавыя сродкі, а таксама кампенсаторным ростам попыту пасля заканчэння грамадзянскай вайны. Дзякуючы дзейнасці ЦэКПБВ у 1922 г. пачалі ствараецца дамы адпачынку, лякарні, развівалася сетка ку-рортаў. Першыя санаторыі былі адчынены ў сяле Вузкі (недалёка ад Масквы), у Гаспры (Крым) – на 40 пастаяльцаў, сяле Бальшове (каля 30 км ад Масквы) – на 20 пастаяльцаў [11, арк. 20].

Адпаведная работа праводзілася і ў БССР. У сакавіку 1923 г. БелКПБВ адаслала зварот да Наркамасветы аб адкрыцці дома адпачынку «Крынкі» (цяпер Віцебская вобласць), які ў гэтым жа годзе пачаў сваю дзейнасць. Па ініцыятыве БелКПБВ абмяркоўваўся праект стварэння дома адпачынку і выдзялення зямельных плошчаў для лецішчаў у Весялоўцы (цяпер мікрараён Мінска). Ён пачаў дзейнасць у маі 1924 г. (першапачаткова на 25 месцаў, пазней даведзена да 50) [12, арк. 15]. Мелі спробы прасоўвання ідэі арганізацыі іншых дамоў санаторнага тыпу, якія не былі рэалізаваныя [13, арк. 310–312].

У справаздачах Рабасветы адзначалася, што ўстановы санаторнага тыпу ЦэКПБВ на пачатак 1920-х гг. з'яўляліся, па сутнасці, дамамі адпачынку. Разам з навукоўцамі маглі аказацца і хворыя рабочыя, што выклікала пратэст Секцыі [14, арк. 39]. У другой палове 1920-х гг. сітуацыя змянілася: пашырылася сетка курортаў ЦэКПБВ, арганізоўваліся лецішча для карыстання выключна вучонымі [15, арк. 2]. Пуцёўкі размяркоўваліся паводле наступных крытэрыяў: найперш іх атрымоўвалі шматдзетыя сем'і, а потым тыя, хто карыстаўся курортнымі паслугамі ў папярэднім годзе. Пры іншых роўных умовах на паправу здароўя адсылалі найбольш кваліфікаваных навукоўцаў [16, арк. 116] альбо тых, хто меў шэраг заслуг. Напрыклад, Інбелкульт прасіў СНР накіраваць з 15 мая па 15 чэрвеня ў Гурзуфскі дом адпачынку А. А. Грыневіча, які на працягу 20 год збіраў і апрацоўваў беларускія песні і ўсе грошы аддаваў на гэтую дзейнасць [17, арк. 227]. Лячэбныя рэкамендацыі па курортах выглядалі наступным чынам (табліца 1).

Табліца 1 – Лячэбна-курортныя рэкамендацыі [18, арк. 220]

| Дыягназ | Курорт |
|---|---|
| Міякардыт, неўроз сэрца | Ялта |
| Малакроўе | Кіславодск |
| Сустаўны рэўматызм | Есентукі |
| Хранічны сустаўны рэўматызм | Адэса |
| Неўрастэнія | Кіславодск |

Праз анкетны матэрыял і прадстаўленыя на паседжаннях БелКПБВ і СНР дадзеныя выяўляецца тое, што 90 % навукоўцаў Беларусі меліператамленне [19, арк. 14]. Сустракаліся захворванні органаў дыхання, сасудаў і сэрца, нервовай сістэмы, страўнікава-кішэчнага тракту і інш. Таму накірункаў санаторна-курортнага забеспячэння было шмат: Крым, Сочы, Харкаў, Кіславодск, Есентукі, Анапа, Адэса, Жалезнаводск, Сімяіз і г. д.

Для абгрунтавання паездкі патрабаваліся ўліковая картка, анкета і медыцынская даведка [20, арк. 29]. Яны ўяўлялі сабой тыповыя фармуляры, дзе прапісваўся не толькі фізічны стан, але і асабістыя заслугі, сацыяльны статус кожнага кандыдата, канкрэтнае захворванне і неабходны тэрмін знаходжання на курорце ці ў санаторыі. На-

прыклад, доктар Л. П. Разанаў у 1924 г. у якасці абгрунтавання тэрміновага лекавання Г. С. Блоха пісаў: «Сведчу, што настаўнік англійскай мовы ў БДУ Г. С. Блох сапраўды мае патрэбу ў лячэнні ў Крыму, не менш 6 тыдняў, у следстве нервова-мышачнай слабасці на падставеператамлення і перанесенай зімой інфлюэнцыі (вострае інфекцыйнае захворванне дыхальных шляхоў, выкліканае вірусам грыпу і небяспечнае для жыцця пры недастатковым лекаванні) з цяжкімі наступствамі. Таксама сведчу, што жонка яго, М. В. Блох, пакутуе на хранічны артрыт, які патрабуе лячэння гразевымі ваннамі» [21, арк. 60]. Час адпачынку абмяжоўваўся, як правіла, 30 днямі, але пры цяжкіх захворваннях мог быць падоўжаны на падставе рашэнняў спецыяльных камісій [22, арк. 54; 21, арк. 80; 23, арк. 55].

Санаторна-курортнае забеспячэнне вучоных ажыццяўлялася праз рэгулярныя дзяржаўныя субсідыі, якія з’яўляліся асноўнай крыніцай яго фінансавання. Даходы ад лекцый, выданняў і мерапрыемстваў таксама ўключаліся ў каштарыс арганізацый, як і ахвяраванні ад прыватных ліц і прадпрыемстваў [24, арк. 93]. Для атрымання дадатковага грашовага рэзерву БелКПБВ 1 кастрычніка 1924 г. на падставе рашэнняў V Усебеларускага з’езда прыняла пастанову аб стварэнні спецыяльнага курортнага фонду. Унёскі ад членаў саюза складалі 0,5 % заробку [15, арк. 2].

Пуцёўка без аплаты дарогі на крымскія курорты Сакі і Еўпаторыі летам 1924 г. з улікам усіх зніжкаў каштавала 140 руб. на месяц, а Анапы (поўдзень Расіі) – 120 руб. [25, арк. 113]. У 1923/24 г. заробак прафесара ўніверсітэта у сярэднем складаў 56 руб., дацэнта – 49 руб., асістэнта – 46 руб. Стаўка па асноўнай пасадзе ў 1924/25 г. для прафесара была 80 руб, дацэнта – 70 руб., асістэнта – 55 руб. [17, арк. 184]. БелКПБВ і Секцыя стваралі магчымасць бясплатнай (напрыклад, Я. І. Барычэўскі з 15 кастрычніка па 15 лістапада 1924 г. [25, арк. 34]) ці паўплатнай (Т. Клопаў у Гаспры з 15 верасня па 15 кастрычніка 1924 г. [25, арк. 34]) пуцёўкі альбо аплаты з растэрміноўкай (адзін з варыянтаў: 30 % пры браніраванні, 20 % за месяц, астатнія 50 % на працягу паўгода з вылікам сумы з заробку [25, арк. 34–35]). Пры размеркаванні навукоўцам маглі выдаць спецыяльнае пасведчанне, згодна з якім яны атрымлівалі зніжку на праезд у абодва бакі, харчаванне, некаторыя медыцынскія працэдуры [21, арк. 2]. Пералічаныя вышэй ільготы, шанец атрымання лячэння альбо адпачынку стваралі вялікі попыт на санаторна-курортныя паслугі.

Для малодшых навуковых супрацоўнікаў перспектыва паездкі на курорт была дадаткова значным стымулам залічэння ў БелКПБВ і СНР. Напрыклад, у заяве на ўступленне ў Секцыю навуковых работнікаў (1927 г.) адзначалася: «Медыцынская курортная камісія прызначыла патрэбным паехаць мне ў Кіславодск. На ўласныя сродкі я гэтага зрабіць не магу. Зыходзячы з гэтага, прашу СНР запісаць мяне ў секцыю, вызначыць грашовую дапамогу на курортнае лячэнне з ільготным праездам па чыгунцы» [21, арк. 38]. Вышэйшыя навучальныя і навукова-даследчыя ўстановы, якія не маглі прадставіць сваім работнікам небходную дапамогу ў санаторна-курортным пытанні, звярталіся да Секцыі. Так, праўленне Камуністычнага ўніверсітэта хадайнічала: «З прычыны таго, што Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі не прадставіў для навуковых работнікаў універсітэта ніводнага месца на курорт, нягледзячы на вялікую патрэбу, асабліва сярод малодшых навуковых работнікаў, якія дрэнна матэрыяльна забяспечаны, фракцыя праўлення просіць вас прыняць іх пад увагу пры размеркаванні курортных месцаў альбо аказаць адпаведную матэрыяльную дапамогу» [17, арк. 306].

Пасля паездкі навукоўцам неабходна было прадставіць СНР справаздачу аб якасці паслуг. Наяўныя дакументы дазваляюць зрабіць выснову, што найлепшай рэпутацыяй карыстаўся санаторый «Буюрнус» (Крым) і дамы адпачынку Адэсы. Аб курортах Сочы і Ялты часцяком пісаліся адмоўныя водгукі. Напрыклад, у санаторыі № 2 г. Сочы ў сярэдзіне 1920-х гг. 25 % пастаяльцаў хварэла на страўнік [22, арк. 215]. Узровень адукацыі і культуры дазваляў вучоным пісаць шчырыя, але неадназначныя водгукі: «Лёгкі флірт без усялякіх наступстваў яшчэ больш прыхарошваў сапраўдны адпачынак». Дарэчы, яго «наступствы» часам адбіваліся і на фізічных паказчыках: адзін з вучоных, запаўняючы анкету, указаў на тое, што паправіўся на 18,5 фунта (8 кг), другі – на 16 фунтаў (7 кг) [19, арк. 14].

Выкладчык рабфака БДУ Я. М. Кругер такім чынам распавядаў пра вынікі свайго турыстычнага шляху (студзень 1927 г.): «Атрымаўшы ад СНР, членам якой я з'яўляюся, субсідыю на паездку і зніжку на чыгуначны праезд, я выкарыстаў іх наступным чынам: жадаючы здзейсніць навукова-мастацкую паездку па Волзе, я выехаў у Ніжні Ноўгарад. Па дарозе спыніўся на некалькі дзён у Маскве і наведаў "Асацыяцыю мастакоў рэвалюцыйнай Расіі (АМРР)" і іншыя мастацкія ўстановы. У Ніжнім я сеў на параход "Васіль Фамін". Праплыў Казань, Сімбірск, Самару, Сызрань, Саратаў. Тады на Волзе было добрае надвор'е. Не толькі на кожным прыпынку з берага пісаў эцюды, але і на палубе. Прабыў у Саратаве некалькі дзён, да Астрахані грошай не хапіла (на параходны квіток зніжкі не было). Заехаў у Казань, наведаў таварыша па Акадэміі. Вярнуўся праз Маскву ў Мінск. Выехаў 20 чэрвеня і прыбыў у апошніх днях ліпеня» [22, арк. 10].

Анкеты работнікаў навукі, якія карысталіся санаторна-курортным абслугоўваннем у 1922–1924 гг., няпоўныя у сувязі з тым, што не ўсе справаздачы Камісіі па паляпшэнні побыту вучоных захаваліся, а Секцыя толькі пачынала сваю дзейнасць.

Часткова матэрыялы гэтага часу адлюстраваны ў перапісцы паміж арганізацыямі: ЦэКПБВ, саюзнымі Секцыямі і Камісіямі, Саўнаркамам, Галоўным курортным упраўленнем (Галоўкурупр) НКАЗ СССР. Так, у Маскву (май 1924 г.) былі накіраваны дакументы, у якіх прапаноўвалася змяніць квоты для БССР з 4 да 12 месцаў на ліпень [25, арк. 1, 29, 48]. У выніку працяглай дыскусіі колькасць пуцёвак была павялічана да 11 пры абавязковай умове ўнесці ў якасці перадаплаты 30 % ад агульнага кошту) [25, арк. 48].

Дамова паміж СНР Беларусі (прадстаўнікі: старшыня Секцыі С. Я. Вольфсан, сакратар А. К. Успенскі) і Галоўным курортным упраўленнем (ад БССР загадчык курортнага бюро С. А. Мазель, май 1924 г.) дае ўяўленне аб гадавой колькасці пуцёвак, якую прадстаўляў Галоўкурупр Секцыі (табліца 2).

Табліца 2 – Размеркаванне месцаў ад Галоўкурупр на 1924 г. [25, арк. 113–114]

| Санаторый | Дата | Колькасць |
|---|---|---|
| Сіміз | 01.06–01.09 | 2 бясп. (Секцыя аплачвала сама дадзеныя пуцёўкі) і 3 па 150 руб. |
| Анапа | 15.07–01.09 | 2 бяспл. і 3 па 120 руб. |
| Жалезнаводск | 15.06–15.09 | 2 бяспл. і 3 па 180 руб. |
| Сакі | 15.06–01.09 | 2 бяспл. і 3 па 140 руб. |
| Еўпаторыя | 15.07–01.09 | 2 бяспл. і 3 па 140 руб. |
| Усяго | 10 бяспл., 15 платных (2 190 руб.) | |

На пасяджэнні Рабасветы (кастрычнік 1924 г.) СНР прадстаўлены яшчэ 10 пуцёвак [26, арк. 164]. Праз дзейнасць Секцыі мінімум 46 дзеячаў навукі Беларусі атрымалі месцы на курортах (21 – па лініі Цэнтральнай камісіі, 25 – па дамове з Галоўкурупр, 10 – дадатковых).

Пасля ліквідацыі БелКПБВ (2 красавіка 1924 г.) [7, арк. 78] ЦэКПБВ выдзяляла датацыі нерэгулярна, а ўсесаюзная Секцыя амаль не выдавала пуцёўкі ў санаторыі на ільготных умовах. Таму Цэнтральнае бюро беларускай СНР хадайнічала перад Саўнаркамам БССР аб спецыяльных грашовых выплатах на курортную падтрымку [16, арк. 12–19]. У 1925 г. Секцыя, якая налічвала 250 асоб [27], атрымала грошы для закупкі курортных пуцёвак 54 навукоўцам Беларусі [16, арк. 12–19].

Агульны лік членаў СНР Беларусі і звесткі па колькасці курортных месцаў дазваляюць вызначыць удзельную вагу навуковых работнікаў, якім былі прадстаўлены санаторна-курортныя паслугі па гадах (табліца 3).

Табліца 3 – Удзельная вага членаў Секцыі, якія атрымалі санаторна-курортную дапамогу

| Год | Колькасць членаў Секцыі | Колькасць атрыманых месцаў | Удзельная вага, % |
|---|---|---|---|
| 1925 | 250 | 54 | 21,6 |
| 1926 | 359 | 70 | 19,4 |
| 1927 | 403 | 84 | 20,8 |
| 1928 | 509 | 110 | 21,6 |
| 1930 | 712 | 157 | 22 |

У 1926 г. паказчык удзельнай вагі зменшыўся да 19,4 %. За год курортнымі паездкамі скарысталіся 70 працаўнікоў навукі БССР [22, арк. 122] (на 1 снежня 1926 г. беларуская Секцыя складалася з 359 чалавек [16, арк. 188]). Такая колькасць была абумоўлена адсутнасцю ў БССР арганізацыі, аналагічнай ліквідаванай Камісіі па паляпшэнні быту вучоных. КПБВ РСФСР і УССР на рэгулярнай аснове адкрывалі санаторыі, аказвалі дапамогу сваім супрацоўнікам, тым самым развіваючы навуку, а Секцыя атрымлівала толькі аднаразовыя грашовыя выплаты пасля шматлікіх запытаў [28, арк. 333].

Секцыя навуковых работнікаў 16 мая 1926 г. выступіла з прапановай аб стварэнні пры СНК БССР новай Камісіі з мэтай уключэння ў дзяржаўны бюджэт выдаткаў на курортную дапамогу і іншую падтрымку [7, арк. 79]. Архіўныя дакументы не дазваляюць вызначыць канкрэтную дату пачатку дзейнасці новай КПБВ у Беларусі, якая стала структурным падраздзяленнем Секцыі [28, арк. 322]. У чэрвені Бюро СНР прадставіла яе прыблізны каштарыс 1926/27 г. на суму 42 000 руб. [16, арк. 111, адв.]. У ліпені ён быў зменены, і на санаторную дапамогу меркавалася выдзяліць 12 000 руб. (усяго – 37 700 руб.) [28, арк. 327].

Аднак 30 верасня 1926 г. Наркамасветы зменшыў агульны бюджэт арганізацыі да 10 000 руб. [16, арк. 113, 186]. Падобныя фінансавыя абмежаванні не дазвалялі арганізацыі аказваць сур’ёзны ўплыў на пытанне санаторна-курортнага забеспячэння. Другая Камісія юрыдычна і фактычна была ліквідавана 30 сакавіка 1927 г. [7, арк. 82].

М. Н. Пятуховіч (беларускі літаратуразнавец, крытык; з 1921 г. быў членам навукова-тэрміналагічнай камісіі, у лютым 1922 г. стаў навуковым супрацоўнікам. 1925 г. – правадзейны член Інбелкульта, 1929 г. правадзейны член беларускай Акадэміі навук (да 1936 г. працаваў у Інстытуце літаратуры БелАН), член СНР.) на ІІІ Усебеларускім з’ездзе навуковых работнікаў (1927 г.) адзначаў, што вучоныя Беларусі ў адносінах санаторна-курортнай дапамогі – «пасынкі» ў параўнанні з навукоўцамі РСФСР і УССР [22, арк. 101адв.].

У гэты ж час Беларуская секцыя ў лістах да СНР Украіны хадайнічала аб прадстаўленні курортных месцаў у іх дамах адпачынку, таму што «сродкі, атрыманыя ад ЦэКПБВ, надзвычай абмежаваныя, іх не хапае. І, знаходзячыся ў амаль аднолькавых умовах працы з іншымі савецкімі рэспублікамі, ЦБ Беларусі вымушана прасіць» [17, арк. 131].

Патрэбы членаў Секцыі ў санаторным забеспячэнні сапраўды павялічыліся ў вынікуператамлення прадстаўнікоў навукі выкладчыцкай і іншай працай. Так, у рэзалюцыі па дакладзе ЦБ СНР канстатавалася перагружанасць навукоўцаў, слабая забяспечанасць і цяжкія ўмовы работы (адсутнасць бібліятэк, малая колькасць камандзіровак, абмежаванасць сродкаў на друк, недахоп фондаў, перыядычныя скарачэнні) [22, арк. 156].

Падчас агульнага сходу асістэнтаў і ардэнатараў БДУ (16 студзеня 1927 г.) азначалася, што «эксплуатацыя клініцыстаў і нізкая аплата прымушаюць іх шукаць працу ў лекавых установах НКЗ, што вядзе да падрыва навуковай работы. Нагрузка асістэнта па клініцы раўна прыкладна шэсці гадзінам, як і праца на старане, а са студэнтамі ім неабходна займацца амаль штодзённа каля трох гадзін» [22, арк. 45].

БелКПБВ звярнулася ў Наркамасветы з просьбай аб выдачы ўсёй сумы грошай, выдзеленых СНК Беларусі на курортную дапамогу па прычыне дэфіцыту бюджэту [17, арк. 182]. На гэты запыт Народны камісарыят асветы асігнаваў на курортную кампанію для навукоўцаў 5 000 руб. [2, арк. 98]. На 3 450 руб. секцыя закупіла 47 пуцёвак (30 у Крым, 8 у Сочы, 6 у Адэсу, 1 у Кіеў, 2 у Харкаў [14, арк. 3]). Астатнія сродкі былі размеркаваны па аддзелах у якасці грашовай дапамогі вучоным для аздараўлення: Мінскі – 875 руб., Горацкі – 505 руб., Віцебскі – 170 руб. [14, арк. 3] (табліца 4).

За год санаторна-курортную дапамогу атрымалі 84 члены саюза [22, арк. 101адв.]. Улічваючы тое, што арганізацыя аб’ядноўвала 403 супрацоўнікі [29], доля задаволеных запытаў склала 20,8 %.

Табліца 4 – Размеркаванне субсідый на санаторна-курортны адпачынак (1927 г.) [29]

| Аддзел секцыі | Сума субсідый, руб. | Колькасць субсідый |
|---|---|---|
| Мінск | 54–100 | 21 |
| Горкі | 90–145 | 14 |
| Віцебск | 30–50 | 5 |
| Усяго | | 40 |

У 1928 г. курортная дапамога была аказана 110 сябрам СНР [2, арк. 98] (усяго 509 супрацоўнікаў [30]). З кастрычніка 1929 па красавік 1930 г. на санаторна-курортную дапамогу прэтэндавала звыш 60 членаў Горацкага аддзялення Секцыі, задаволілі толькі 16 [31, арк. 24]. У межах рэспублікі паказчык узрос: на 1930 г. Секцыя налічвала 712 чалавек [32, арк. 104–105], а санаторна-курортнае абслугоўванне атрымалі 157 асоб [31, арк. 57] (22 %).

**Заключэнне**

Актуальнасць сістэмнай рэалізацыі санаторна-курортнай палітыкі звязана са станам здароўя вучоных, пагаршэнне якога выклікана наступствамі сацыяльна-эканамічных змен пачатку XX ст. Беларуская камісія па паляпшэнню побыту вучоных і Секцыя навуковых работнікаў арганізоўвалі для вучоных платныя, бясплатныя і паўплатныя паездкі на курорты і ў санаторыі, давалі растэрміноўку для аплаты, часткова фінансавалі выдаткі на транспартныя паслугі, пражыванне і харчаванне, некаторыя медыцынскія працэдуры.

Навуковыя працаўнікі ехалі ў Ялту пры міякардыце і неўрозе сэрца, Кіславодск пры малакроўі і неўрастэніі, Есентукі пры сустаўным рэўматызме, Адэсу пры хранічным сустаўным рэўматызме. Беларускія работнікі навукі мелі магчымасць наведаць санаторыі ў Крыме і Падмаскоўі.

Папулярнымі накірункамі таксама з'яўляліся Сочы, Харкаў, Анапа, Жалезнаводск, Сіміз. Дзякуючы дзейнасці ЦэКПБВ у БССР пачалося стварэнне беларускіх дамоў адпачынку і санаторыяў («Крынкі» ў сучаснай Віцебскай вобласці, «Весялоўка» пад Мінскам), што прывяло да росту ўнутранага турызму.

Самы нізкі працэнт (19,4) задаволеных заяў навуковых супрацоўнікаў на курортную дапамогу прыйшоўся на 1926 г., у сувязі з чым было прынята рашэнне аб аднаўленні дзейнасці БелКПБВ. СНР Беларусі атрымлівала толькі аднаразовыя грашовыя выплаты пасля шматлікіх запытаў у той час, калі першапачатковая Камісія па паляпшэнні побыту вучоных мела сталую фінансавую падтрымку і значныя ільготы праз ЦэКПБВ. З прычыны таго, што каштарыс новай арганізацыі быў невялікі, а статус зменшыўся да аддзела Секцыі, яе дзейнасць хутка спынілася.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Корзенко, Г. В. Организация историко-научных исследований в Институте истории НАН Беларуси (1973–2013 гг.) / Г. В. Корзенко, И. И. Шевчук. – Брест : БрГУ, 2015. – 230 с.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4138.

3. Лукашук, А. Прыгоды АРА ў Беларусі / А. Лукашук. – Прага : Радыё Свабодная Эўропа, 2005. – 500 с.

4. Иоффе, Э. Г. Джойнт в Беларуси / Э. Г. Иоффе, Б. А. Мельцер. – Минск : Magic Book, 1999. – 94 с.

5. Ботвинник, М. Первые шаги Джойнта в Беларуси [Электронный ресурс] / М. Ботвинник // Беларусь у XX стагоддзі. – Минск, 2003. – Вып. 2. – Режим доступа: http://mb.s5x.org/-homoliber.org/ru/xx/xx020105.html. – Дата доступа: 02.08.2021.

6. Шаўчук, І. І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.) / І. І. Шаўчук. – Брэст : БрДУ, 2007. – 293 с.

7. Шевчук, И. И. Обеспечение деятельности научной интеллигенции Беларуси в первой половине 1920-х годов: создание Комиссии по улучшению быта ученых / И. И. Шевчук // Интеллигенция и мир. – 2017. – № 1. – С. 68–84.

8. Дубовик, А. К. Создание и деятельность профессиональной организации научной интеллигенции Беларуси / А. К. Дубовик, Е. А. Дубовик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2007. – № 4. – С. 8–13.

9. Иванова, Л. В. Формирование советской научной интеллигенции (1917–1927 гг.) / Л. В. Иванова. – М., 1980. – 392 с.

10. Кузнецов, Ю. С. Вовлечение интеллигенции в социалистическое строительство (1917–1925 гг.): на материалах партийных организаций Белоруссии / Ю. С. Кузнецов. – Минск : Беларусь, 1982. – 113 с.

11. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 33.

12. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 80.

13. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 88.

14. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 474.

15. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 158.

16. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 151.

17. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 285.

18. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 702.

19. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 237.

20. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 91.

21. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 282.

22. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 275.

23. Организация науки в первые годы Советской власти (1917–1925 гг.) : сб. докл. – Л., 1968. – 425 с.

24. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 125.

25. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 90.

26. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 83.

27. Липец, И. Участие научных работников в союзной работе / И. Липец // Прафэсіянал. рух Беларусі. – 1925. – № 4. – С. 14–15.

28. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 365.

29. Вольфсон, С. Я. Белорусская секция научных работников / С. Я. Вольфсон // Науч. работник. – 1927. – № 9. – С. 40–48.

30. Вольфсон, С. Я. Культурная рэволюцыя ў дзеяньні. Нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР : да 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэволюцыі / С. Я. Вольфсон. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1932. – 46 с.

31. НАРБ. – Ф. 306. Воп. 1. Спр. 536.

32. Прокопчук, А. Итоги деятельности Белорусской секции научных работников / А. Прокопчук // Науч. работник. – 1930. – № 11–12. – С. 114–118.

## REFERENCES

1. Korzienko, G. V. Organizacija istorikonauchnykh issliedovanij v Institutie istorii NAN Bielarusi (1973–2013 hh.) / G. V. Korzienko, I. I. Shevchuk. – Briest : BrGU, 2015. – 230 s.

2. Nacyjanal’ny arkhiu Respubliki Bielarus’ (NARB). – F. 4p. Op. 1. Spr. 4138.

3. Lukashuk, A. Pryhody ARA u Bielarusi / A. Lukashuk. – Praha : Radyjo Svabodnaja Europa, 2005. – 500 s.

4. Ioffe, E. G. Dzhojnt u Bielarusio / E. G. Ioffe, B. A. Miel’tzer. – Minsk : Magic Book, 1999. – 94 s.

5. Botvinnik, M. Piervyje shagi Dzhojnta v Bielarusi [Eliektronnyj riesurs] / M. Botvinnik // Bielarus’ v XX stahoddzi. – Minsk, 2003. – Vyp. 2. Riezhim dopuska: http://mb.s5x.org/homoliber.org/ru/xx/xx020105.html. – Data dopuska: (access date: 08/02/2021).

6. Sharchuk, I. I. Humanitarnyja navuki u sacyjal’naj historyi Bielarusi (20–30-ja hh. XX st.) / I. I. Shauchuk. – Brest: BrDU, 2007. – 293 s.

7. Shevchuk, I. I. Obiespiechienije diejatiel’nosti nauchnoj intielligiencii Bielarusi v piervoj polovinie 1920-kh godov: sozdanije Kommissii po uluchsheniju byta uchionykh / I. I. Shevchuk // Intielligiencija i mir. – 2017. – № 1. – S. 68–84.

8. Dubovik, A. K. Sozdanije i diejatiel’nost’ profiessional’noj organizacii nauchnoj intielligiencii Bielarusi / A. K. Dubovik, Ye. A. Dubovik // Trud. Profsojuzy. Obshchiestvo. – 2007. – № 4. – S. 8–13.

9. Ivanova, L. V. Formirovanije sovietskoj nauchnoj intielligiencii (1917–1927 gg.) / L. V. Ivanova. – M., 1980. – 392 s.

10. Kuzniecov, Yu. S. IVovliechienije intielligiencii v sociolistichieskoje stroitiel’stvo (1917–1925 gg.): na matierialakh partijnykh organizacij Bielorussii / Yu. S. Kuznietsov. – Minsk : Bielarus’, 1982. – 113 s.

11. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 33.

12. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 80.

13. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 88.

14. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 474.

15. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 158.

16. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 151.

17. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 285.

18. NARB. – F. 4p. Op. 1. Spr. 702.

19. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 237.

20. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 91.

21. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 282.

22. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 275.

23. Organizacija nauki v piervyje gody Sovietskoj vlasti (1917–1925 gg.) : sb. dokl. – L., 1968. – 425 s.

24. NARB. – F. 42. Op. 1. Spr. 125.

25. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 90.

26. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 83.

27. Lipiec, I. Uchastije nauchnykh rabotnikov v sojuznoj rabotie / I. Lipiec // Prafiesijanal. rukh Bioelarusi. – 1925. – № 4. – S. 14–15.

28. NARB. – F. 42. Op. 1. Spr. 365.

29. Vol’fson, S. Ya. Bielorusskaja siekcija nauchnykh rabotnikov / S. Ya. Vol’fson // Nauch. rabotnik. – 1927. – № 9. – S. 40–48.

30. Wol’fson, S. Ya. Kul’turnaja revaliucyja u dziejanni. Nacyjanal’na-kul’turnaje budaunictva BSSR : da 15-hoddzia Kastrychnickaj revaliucyi. – Minsk. : Dziarzh. vyd-va Bielarusi, 1932. – 46 s.

31. NARB. – F. 306. Op. 1. Spr. 536.

32. Prokopchuk, A. Itogi diejatiel’nosti Bielorusskoj siekci nauchnykh rabotnikov / A. Prokopchuk // Nauch. rabotnik. – 1930. – № 11–12. – S. 114–118.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 05.09.2023*